Л. К. Кухто *(г. Мінск)*

# БУКВАР І. К. КАНДРАЦЬЕВА, ПРЫЗНАЧАНЫ ДЛЯ ГРАМАТЫ І ДАБРАДЗЕЙНАГА РАЗВІЦЦЯ

У педагагічнай скарбонцы ўдалося выявіць яшчэ адзін твор – самавучыцель, складзены І. Кандрацьевым. Адчуваючы значнасць адукацыі для грамадства, І. Кандрацьеў паспрабаваў прапанаваць жадаючым авалодаць граматай буквар, з дапамогай якога можна было б самастойна навучыцца чытаць і пісаць, выконваць нескладаныя матэматычныя вылічэнні. Вядома, што далёка не ўсе ў Расійскай імперыі мелі магчымасць наведваць школу. Па перапісе 1897 г., у Еўрапейскай частцы Расіі было толькі 19 % пісьменных [1, с.284]. Таму перадавая руская інтэлігенцыя стварае шэраг азбук, гэта значыць дапаможнікаў для першапачатковага навучання грамаце, напрыклад «Азбука и уроки чтения и письма» (1871) М.Ф. Бунакова, «Новая азбука» (1875) Л.М. Талстога, «Азбука для обучения грамоте по естественному методу» (1910) М.І. Цімафеева. Як была ў складзе Расійскай дзяржавы, Беларусь займела буквар на роднай мове пазней – у 1906 г. Ён называўся «Bielaruski lementar, abo Pierszaja nawuka czytania». Праз некалькі тыдняў пасля лацінкавага варыянту быў выдадзены выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша ваконца» лемантар кірыліцай. Аўтары ў выданнях прыведзены не былі. У гэтым жа, 1906, годзе з’явілася першая беларускамоўная чытанка – «Першае чытанне для дзетак беларусаў» вядомай паэткі Цёткі, а ў 1909 г. – «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Я. Коласа. Такую сітуацыю Я. Колас тлумачыў тым, што «складанне добрага лемантара вымагае больш уважнай, больш маруднай і труднай работы, чым кніга-чытанка» [2, с.498]. Да таго ж часу ў Беларусі былі толькі азбукі, якія склалі рускія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагогі. Магчыма, па «Полному самоучителю русской азбуки в зоологических картинах», які склаў у 1896 г. І. Кандрацьеў, навучаліся грамаце і дзеці беларусаў…

Рукапіс самавучыцеля рускай азбукі, як паказваюць даследаванні, быў падрыхтаваны яшчэ ў 1893 г., але яго змест два гады прыдзірліва вывучалі маскоўскія цэнзары. І толькі ў маі 1895 г. быў дадзены дазвол на яго выданне. Самавучыцель І. Кандрацьева пабудаваны на аснове сінтэтычнага літараскладальнага метаду. Пасля раздзела, дзе прадстаўлены літары рускай азбукі, паказаны ўзоры напісання вялікіх і малых літар. Каб лепш запаміналася літара, да кожнай дадаецца малюнак свойскай ці дзікай жывёлы альбо птушкі. Дарэчы, заалагічныя малюнкі пакідаюць добрае ўражанне; падабраны з улікам практычнага знаёмства з прыродным асяроддзем дзяцей.

Наступная частка самавучыцеля прысвечана складам. Спачатку даюцца склады з двух гукаў, затым – з трох. За складамі прыводзяцца аднаскладовыя словы (*гром, день, мать* і інш.), пасля іх – вядомыя дзецям двухскладовыя (*не-бо, ру-чей, ут-ро* і інш.). Толькі пасля засваення аднаскладовых і двухскладовых слоў вучні знаёмяцца са шматскладовымі словамі (*ми-ло-сер-ди-е, у-кра-ше-ни-е, че-ре-па-ха* і інш.). На гэтым этапе авалодання тэхнікай чытання дзецям даецца заданне адшукаць у словах знаёмыя ім літары.

Вымаўленне гукаў І. Кандрацьеў прапаноўвае пачынаць з галосных у розных іх спалучэннях, затым у спалучэнні з зычнымі. Чытанне пачынаецца з аднаскладовых частаўжывальных у паўсядзённасці слоў (*конь, кот, сад* і інш.). Тэксты для першага чытання, якія падае аўтар пасля азбукі, скадаюцца ўсяго з двух-трох сказаў, вядомых вершаў, загадак, прыказак і казак. Напрыклад, прапануюцца верш «Петушок», казка «Репка». Для чытання на наступных этапах падабраны цыкл басен І. Крылова, якія маюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павучальны характар. У якасці чытання рэкамендуецца шмат кароткіх апавяданняў пра жывёл і птушак.

Амаль палову старонак самавучыцеля займаюць невялікія па памеры апавяданні пра свойскіх і дзікіх жывёл, птушак, рыб і інш. Пісьменнік не толькі дае іх апісанне, але звяртае ўвагу дзяцей на тое, якую карысць яны прыносяць чалавеку. Так, у апавяданні пра авечак піша: «Овцы доставляют нам мясо, сало, жир и, главным образом, шерсть для одежды. Из шерсти вяжутся теплые чулки, варежки и перчатки, вырабатываются сукна для материи» [3, с.64]. У апавяданні пра вожыка распавядае пра яго службу людзям: «Еж – небольшое и очень полезное животное. Еж днем спит, а ночью уничтожает огромное количество насекомых, червей, мышей, змей и лягушек… В деревнях часто держат ежей в избах, где они вполне заменяют кошку, охотясь на крыс и мышей» [3, с.79–80].

Такім чынам, прынцып пераходу ад лёгкіх для чытання слоў да больш складаных тэкстаў захаваны. Тэксты суправаджаюцца малюнкамі, якіх у самавучыцелю налічваецца 56. Малюнкі абуджаюць у дзяцей цікавасць да кнігі, палягчаюць навуку чытання. Большасць малюнкаў можна выкарыстаць для гутаркі з дзецьмі ў мэтах экалагічнага выхавання.

У самавучыцелю даецца і спецыяльны матэрыял для пісьма. Шэраг старонак адведзены пад прописі, у якіх прыведзены ўзоры напісання літар, потым – і саміх слоў. Навучанне грамаце па самавучыцелю вядзецца ў працэсе сумеснага навучання пісьму і чытанню, прычым наўперад ідзе чытанне, а потым пісьмо.

Вылучаны таксама асобны раздзел для малявання. Аўтар рэкамендуе для набыцця пачатковых навыкаў карыстацца тэхнікай малявання па клетачках. Ім складзена табліца, у якой пазначаны кропкі перакрыжавання ліній. Пры злучэнні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведных кропак можна атрымаць нескладаны малюнак. На старонках для малявання паказаны простыя малюнкі і спосаб іх малявання: контуры дома, вядра, бочкі, лісточка расліны, кнігі і іншых знаёмых дзецям прадметаў.

Адзначым злучанасць адукацыйнай і выхаваўчай функцый у самавучыцелю. Гэта і вышэйпрыведзеныя тэксты пра адносіны чалавека і прыроды. Таксама тэксты для чытання падабраныя ў мэтах духоўна-маральнага выхавання. Аўтар звяртаецца да трох галоўных хрысціянскіх дабрадзейнасцей – гэта вера, надзея і любоў; сямі грахам смяротным процістравіць галоўныя хрысціянскія якасці: гардыні – пакору, срэбралюбству – бескарыслівасць, нястрыманасці – сціпласць. У самавучыцелю даюцца тэксты малітваў, якія чытаюцца перад вучобай, пасля вучобы, перад прыняццем ежы, пасля прыняцця ежы і інш.

На наш погляд, змест самавучыцеля не страціў сваёй актуальнасці і да нашага часу. Безумоўна, методыка навучання пісьму і чытанню цягам стагоддзя істотна змянілася, але як сродак выхавання кандрацьеўскі буквар часткова можа выкарыстоўвацца як настаўнікамі, так і бацькамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


*1. Грамотность* // Педагогический словарь : в 2 т. – М. : Изд-во Акад. пед. наук, 1960. – Т. 1. – 774 с.

*2. Колас, Я.* Збор твораў : у 14 т. / Я. Колас. – Мінск : Мастац. літ., 1976. – Том 12. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы 1947–1956 гг. – 528 с.

*3. Кондратьев, И.К.* Полный самоучитель русской азбуки в зоологических картинах / И.К. Кондратьев. – М. : Типо-литография И.Е. Ермакова, 1896. – 106 с.